прабач..ння. Для такіх выпа..каў у беларускай мове ёсць шэраг выразаў: «Прабачце!», «Выбачайце!», «Даруйце!», «Прашу прабачэння!», «Не крыўдуйце!», «Не сярдуйце!», «Не злуйцеся!». Калі чалавека перапыняюць пры размове, кажуць: «Перапрашаю!» *(Паводле С. Зелянко)*.

Навошта, на вашу думку, трэба прасіць прабачэння?

Спішыце тэкст, устаўляючы прапушчаныя літары. Падкрэсліце словы, якія нельга падзяляць для пераносу.

Як вы просіце прабачэння, калі крыўдзіце аднакласнікаў, бацькоў?

## § 8. Галосныя гукі

**Успамінаем і паўтараем**

**45.** Вусна адкажыце на пытанні.

Колькі галосных гукаў у беларускай мове? Назавіце іх.

Чаму яны атрымалі такую назву?

Які галосны гук не сустракаецца ў пачатку слоў у беларускай мове?

Якія галосныя гукі вымаўляюцца звычайна пад націскам?

!

**Галосныя гукі** ўтвараюцца з дапамогай голасу. Пры іх вымаўленні паветра праходзіць праз поласць рота свабодна, не сустракаючы перашкод.

У беларускай мове 6 галосных гукаў: [а], [о], [у], [ы], [і], [э]. Для іх абазначэння на пісьме выкарыстоўваецца 10 літар: ***а, о, у, ы, э, е, ё, і, ю, я***.

**46.** Прачытайце тэкст. Якой гістарычнай падзеі прысвечаны помнік пагранічнікам?

### Помнік пагранічнікам

У Брэсцкай крэпасці ёсць помнік пагранічнікам і іх **сем'ям**, якія загінулі ў **першыя** дні Вялікай Айчыннай вайны.

На гэтым месцы калісьці знаходзілася вежа. Побач **праходзіў** водаправод, размяшчаліся казармы, склады з боепрыпасамі, стайні.



Трагедыю тых дзён **перадае** скульптура, якая ўвасабляе подзвіг пагранічнікаў, што ідуць у смяротны бой. За імі **назірае** маці з дзíцем. Жанчына з каскі поіць вадой параненага байца *(Паводле В. Канюта)*.

Назавіце ў выдзеленых словах галосныя гукі і літары, якімі яны абазначаны.

Разгледзьце фотаздымак скульптурнай кампазіцыі «Героям граніцы, жанчынам і дзецям, якія мужнасцю сваёй у неўміручасць зрабілі крок» (скульптар Валянцін Занковіч). Як вы разумееце выраз *у неўміручасць зрабілі крок*? Вусна апішыце скульптурную кампазіцыю.

**47.** Спішыце словы. У дужках укажыце, якія гукі абазначаюць выдзеленыя літары.

У з о р: *глеба* [э].

Д**о**бры, м**я**ккі, б**а**гаты, св**е**тлы, пр**ы**гожы, с**у**р’ёзны, рэзкі, л**ю**бімы, дал**ё**кі, ш**ы**рокі, цв**ё**рды, бл**і**зкі.

Якімі літарамі на пісьме абазначаецца цвёрдасць зычных гукаў, а якімі — мяккасць?

Да якой часціны мовы належаць словы?

Назавіце словы з супрацьлеглым значэннем.

**48.** Замяніце ў словах адзін галосны гук так, каб атрымалася новае слова. Запішыце словы парамі.

У з о р: *часты — чысты*.

Сын, лічыць, мара, вусень, крык, парог, коска, сталь, слова, рэчка.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**49.** Запішыце па 3 назвы гарадоў або краін, якія пачынаюцца:
а) з галоснага гука *(Ашмяны, ...)*;
б) з літары, што абазначае два гукі *(Ельск, ...)*.

**50.** Прачытайце тэкст. Назавіце словы, якія з'яўляюцца сродкамі сувязі сказаў.

### Смачная вада

Алёна імчалася да калодзежа. Ёй здавалася, што з першага пасля доўгай ночы вядра вада самая смачная. Дзяўчына з усмешкай даставала вядро з глыбокага калодзежа. Спярша Алёна гучна пацягвала губамі вадзіцу, прылёгшы грудзьмі на край вядзерца. Затым трымала ў роце некалькі хвілін, нібы смакавала, а пасля паціху глытала *(Паводле З. Бядулі)*.

Выпішыце з тэксту словы, у якіх тры галосныя гукі. Укажыце, на якія галосныя гукі падае націск.

У з о р: *Алёна* [о].

Якімі словамі вы апісалі б смак калодзежнай вады?

## § 9. Вымаўленне і правапіс галосных *о, э, а*

**51.** Прачытайце тэкст. Да якога тыпу ён належыць? Абгрунтуйце сваю думку.

### Белка і Зорка

Бабуля налівае ў даёнку цёплай вадзіцы і выходзіць на падворак:
— Белка, Зорка!
Кароўкі, выцягнуўшы шыі, бягуць да бабулі.
У Белкі галава пакрыта густымі шарсцінкамі. Вочы вялікія — па яблыку. Над імі ўзлятаюць чорныя вейкі, быццам крылы маладога шпачка. Шырокая грудзіна нібы перавязана